Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_____________ А. А. Корбут
«___» ____________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СЛОЎНАЕ ДЗЕЯННЕ Ў СВЯЦЕ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01
Рэжысура свят (народныя)*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя), рэгістрацыйны № С 17-1-17/13 вуч.
27.06.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Н. К. Аверкава,* старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*Ю. Д. Царэвіч,* выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*У. А. Мішчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;
*Р. Ф. Маленчанка,* прафесар кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 29.04.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 30.05.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. К. Аверкава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Слоўнае дзеянне ў свяце» займае важнае месца ў комплексе вучэбных дысцыплін па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках). Яна ахоплівае ўсе неабходныя тэарэтычныя і практычныя пытанні, звязаныя з работай над словам. Змест вучэбнай дысцыпліны «Слоўнае дзеянне ў свяце» цесна звязаны з такімі спецыяльнымі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Рэжысура свят», «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра», «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Музычна-шумавое вырашэнне свята».

Дадзеная вучэбная дысцыпліна садзейнічае развіццю і фарміраванню наступных *акадэмічных* і *прафесійных* кампетэнцый спецыяліста:

– умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– умець працаваць самастойна, вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю;

– валодаць якасцямі грамадзянскасці;

– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

– умець працаваць у камандзе;

– быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў;

– праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах;

– выкарыстоўваць новыя кірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях;

– весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці;

– распрацоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят, на іх аснове праводзіць рэстаўрацыю, рэканструкцыю ці трансфармацыю ў сучасным свяце.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – сфарміраваць у будучых рэжысёраў свят веды аб сучаснай тэорыі сцэнічнай мовы, прыродзе моўных зносін; развіць здольнасці студэнтаў у выражэнні сваіх думак пры непасрэдным кантакце са слухачамі, гледачамі; удасканаліць моўную тэхніку і культуру, дапамагчы авалодаць выканальніцкімі навыкамі (слоўным дзеяннем у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разнастайных жанрах літаратурных твораў), засвоіць методыку работы па ўсіх раздзелах дысцыпліны.

Спецыфіка мастацтва святочных дзей і прадстаўленняў ставіць перад рэжысёрам *задачы* ў авалоданні асновамі моўнага дзеяння:

– засваенне студэнтамі тэорыі і методыкі дысцыпліны «Слоўнае дзеянне ў свяце»;

– набыццё практычных навыкаў і ўменняў у чытальніцкім мастацтве;

– авалоданне рэжысёрска-педагагічнымі навыкамі работы над моўным дзеяннем у разнастайных жанрах свята;

– выхаванне моўнага слыху ва ўмовах калектыўнага слоўнага дзеяння;

– авалоданне элементамі дыктарскага і прамоўніцкага майстэрства вуснага слова.

Такім чынам, перад студэнтамі – будучымі рэжысёрамі свят і тэатралізаваных прадстаўленняў стаяць наступныя патрабаванні:

*ведаць:*

– нацыянальныя моўныя традыцыі, іх спецыфічныя асаблівасці;

– арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы;

– тэорыю і методыку работы над знешняй і ўнутранай тэхнікай мовы;

– тэорыю і методыку харавой дэкламацыі;

– логіку мовы ў моўным дзеянні;

– тэорыю і методыку правядзення групавых і індывідуальных заняткаў па дысцыпліне ва ўмовах творчага калектыву;

*умець*:

– спалучаць элементы моўнага дзеяння з элементамі рэжысуры свята;

– карыстацца тэхнікай і культурай мовы ў прафесійнай працы;

– выкарыстоўваць прыём «меладыкламацыі» як выразны сродак у святочнай дзеі;

– рыхтаваць вядучых свята да выступлення;

*валодаць*:

– метадычнымі прыёмамі работы ў калектыўным слоўным дзеянні;

– рэжысёрска-педагагічнымі навыкамі работы над словам у разнастайных моўных жанрах;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– метадамі карэкціроўкі моўных асаблівасцей і галасавых дадзеных у прафесійнай дзейнасці.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу праграма прадугледжвае наведванне студэнтамі святочных мерапрыемстваў, сустрэчы з вядомымі майстрамі слова, праслухоўванне запісаў майстроў вуснага літаратурнага слова, удзел у святочных мерапрыемствах у якасці выканаўцаў, рэжысёраў і інш. Вялікая ўвага нададзена самастойнай рабоце студэнтаў.

На выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Слоўнае дзеянне ў свяце» прадугледжана 222 аўдыторныя гадзіны, з якіх лекцый – 32, практычных заняткаў – 126, індывідуальных заняткаў – 64 гадзіны. Рэкамендаваныя формы выніковага кантролю – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Месца дысцыпліны «Слоўнае дзеянне ў святе» і яе роля ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў і свят. Дысцыпліна «Слоўнае дзеянне ў святе» як комплекс ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для работы над разнастайнымі моўнымі формамі ў святах, абрадах, арганізацыйнай дзейнасці рэжысёраў свята. Слоўнае дзеянне ў развіцці псіхолага-педагагічных і творчых здольнасцей рэжысёраў свята. Характарыстыка асноўных раздзелаў курса. Выкарыстанне ў тэорыі і методыцы выкладання слоўнага дзеяння навейшых даных навуковых дысцыплін: псіхалогіі, логікі, мовазнаўства, камунікацыі, этыкі, эстэтыкі, тэорыі акцёрскага майстэрства і рэжысуры, літаратуразнаўства і тэатразнаўства. Змест, аб'ём і задачы прадмета. Асаблівасці методыкі навучання і выхавання рэжысёраў свята. Самастойная праца студэнтаў у авалоданні моўнымі навыкамі. Віды бягучага і выніковага кантролю. Крытэрыі аб'ектыўнай ацэнкі паспяховасці студэнтаў у павышэнні іх адказнасці за навучальны працэс.

## Раздзел I. Тэхніка мовы

### *Тэма 1. Анатомія і фізіялогія галасамоўнага апарату*

«Міаэластычная» і «нейрахранаксічная» тэорыі голасаўтварэння. Роля цэнтральнай нервовай сістэмы і зваротных сувязей у голасаўтварэнні. Выхаванне галасамоўных навыкаў як фарміраванне ўмоўных рэфлексаў. Метад апасродкаванага ўздзеяння на галасамоўны апарат як адзіна правільны і эфектыўны метад, пабудаваны па арганічных законах прыроды і творчасці. Анатомія, фізіялогія і гігіена галасавога апарату.

### *Тэма 2. Знешняя тэхніка маўлення (дыханне, голас, дыкцыя, арфаэпія)*

Мова ў жыцці і на сцэнічнай пляцоўцы. Узаемасувязь знешняй і ўнутранай тэхнікі слоўнага дзеяння. Працэс успрымання мовы. Знешняя тэхніка вуснага слова ў арганізацыі ўспрымання мовы слухачамі, у забеспячэнні яе разумення, узмацненні яе эмацыянальнага ўздзеяння. Узаемаабумоўленасць асноўных тэм раздзела. Паняцці «фізіялагічнае», «фанацыйнае» ды-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ханне. Фанацыйнае дыханне і яго роля ў моўным дзеянні. Тры віды выдыху, якім адпавядаюць тры розныя характары маўлення. Выхаванне чатырох якасцей фанацыйнага дыхання: глыбіні, вышыні, частаты, блізкасці. Навык «пераключэння» дыхання ў забеспячэнні якаснага гучання мовы ў любых моўных сітуацыях дыялогу, маналогу і інш. Голас і яго роля ў моўным дзеянні. Аб трох функцыях голасу. Атакі гуку. Свабоднае гучанне – аснова пастаноўкі голасу. Мышачная свабода фанацыйных шляхоў, «апора» гуку, рэзанатарнае і мышачнае адчуванне ў знаходжанні «цэнтра» голасу і ўзбагачэнні прыроднага індывідуальнага тэмбру голасу. Зычныя і іх сэнсаўтваральная роля. Галосныя ў мелодыцы мовы. Мова ў жыцці і на сцэне. Характэрныя групы моўных адхіленняў у бытавой мове. Пасіўнасць вымаўленчага апарату, недакладнасць артыкуляцыйных установак, дэфекты ў вымаўленні гукаў. Дыскаардынацыя ў рабоце трох сістэм моваўтваральнага апарату; адсутнасць у гаворачага адчування фанетычнай структуры слова, фразы; арытмія мовы і іншыя адхіленні, якія вядуць да недакладнасці дыкцыі. Моўны слых у выхаванні дыкцыйных звычак. Фанематычны слых у выхаванні дыкцыйных навыкаў. Змест паняцця «арфаэпія». Валоданне літаратурнымі нормамі вымаўлення як абавязковая ўмова культуры мовы. Асноўныя правілы арфаэпіі: закон асіміляцыі зычных; аглушэнне звонкіх зычных у канцы слова; змякчэнне зычных *з, с* перад мяккімі зычнымі. Гаворкі і дыялекты беларускай мовы. Метадычныя прыёмы практычнага авалодання правіламі літаратурнага вымаўлення. Фанематычны слых у рабоце над культурай маўлення.

### *Тэма 3. Практычнае выхаванне элементаў знешняй тэхнікі слоўнага дзеяння*

Прыёмы трэнінгу, якія забяспечваюць апасродкаванае ўздзеянне на работу галасамоўнага апарату. Моўны характар практыкаванняў як асноўны від трэніроўкі моўнага слыху. Метад гульні. Выклічнікі ў развіцці голасу. Прыём імітацыі і гукапераймання. Вершы як адзін з відаў трэніровачнага матэрыялу. Трэніроўка мовы ў руху. Мэтавыя ўстаноўкі практыкаванняў. Кантроль за выкананнем творчай і тэхнічнай мэты практыкаванняў як абавязковая ўмова эфектыўнасці трэніроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Комплексны трэнінг*
*(псіхафізічны, дыхальна-галасавы, дыкцыйна-арфаэпічны)*

Значэнне трэніроўкі мовы: формы № 1 (у стане мышачнага разняволення, спакою), № 2 (у стане эмацыянальна-валявога ўзбуджэння). Роля санорных і выбухных зычных у галасавым трэнінгу. Выхаванне гучання ў каардынацыі з фізічнымі рухамі і дзеяннямі. Прыёмы развіцця гукавышыннага дыяпазону і сілы голасу. Умовы захавання якаснага гучання голасу пры разнастайных зменах сілы, вышыні гуку, хуткасці маўлення, яе экспрэсіі. Моўны слых у развіцці голасу. Каардынацыйная дзейнасць трох сістэм голасаўтваральнага органа ў дыкцыйным трэнінгу. Трэніроўка зычных у ізаляваным выглядзе, гуказлучэннях, словах, фразах, спецыяльных тэкстах. Паняцце «сцэнічная скорагаворка». Тыпы скорагаворак. Навык пераключэння дыхання ў забеспячэнні якаснага гучання пры пераходзе ад павольнага да хуткага тэмпу вымаўлення тэксту. Методыка выпраўлення індывідуальных моўных недахопаў.

## Раздзел II. Слоўнае дзеянне

*Тэма 5. Элементы ўнутранай тэхнікі слоўнага дзеяння*
*ў выканальніцкім майстэрстве*

Накіраванасць слоўнага дзеяння на змяненне сітуацыі. Бачанні, уяўленні, увага, адносіны, воля. Мысленне і ўяўленне. Развіццё творчага ўяўлення і фантазіі. Бачанні і адносіны. «Кінастужка» бачанняў. Навык перадачы бачанняў. Падтэкст. Успрыманне, ацэнка і выбар дзеяння. Зносіны. Мышачны кантроль у эмацыянальныя моманты выступлення. Унутраныя і знешнія аб’екты зносін. Імправізацыя. Скразное дзеянне і звышзадача. Мэтавыя ўстаноўкі ў рабоце над вучэбна-творчым матэрыялам кожнага семестра.

*Тэма 6. Этапы работы над тэкстам*

Публіцыстычны матэрыял у развіцці творчага ўяўлення, у авалоданні лагічнай перспектывай, навыкамі яркага і дакладнага выяўлення адносін да зместу мовы, валявога пасылу «ад сябе» з мэтай уздзейнічаць на аўдыторыю ў неабходным кірунку. Выбар літаратурнага матэрыялу: ідэйна-мастацкія вартасці твора, актуальнасць тэмы, адпаведнасць матэрыялу індыві-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дуальным асаблівасцям студэнта, узровень здольнасцей і ступень падрыхтаванасці выканаўцы, эмацыянальная захопленасць выбраным матэрыялам. Асноўныя этапы работы над тэкстам: 1) пазнанне аўтарскай задумы (дзейсны аналіз твора); 2) работа над увасабленнем аўтарскай і выканальніцкай задумы; 3) выкананне матэрыялу. Пазнанне твора як складаны псіхічны працэс. К. С. Станіслаўскі аб ролі першага эмацыянальнага ўспрымання матэрыялу. Вызначэнне канфлікту, тэмы, ідэі, звышзадачы. Вывучэнне структуры твора: экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння, кульмінацыі, развязкі канфлікту, фіналу. Падпарадкаванне кожнай часткі галоўнай задуме твора і выканальніцкай задачы. Авалоданне трыма перспектывамі мовы: лагічнай, перажываемага пачуцця, мастацкай. Адбор выразных сродкаў мовы. Паводзіны на сцэнічнай пляцоўцы. Выкарыстанне жэстава-мімічных сродкаў выразнасці. Спосаб зносін з гледачамі.

*Тэма 7. Інтанацыйна-меладычныя сродкі слоўнага дзеяння*

К. С. Станіслаўскі аб выразных сродках мовы. Логіка ў моўным дзеянні. Лагічны націск, моўныя такты. Лагічныя і псіхалагічныя паўзы. Асноўныя правілы вылучэння слоў. К. С. Станіслаўскі аб дзейснай прыродзе знакаў прыпынку. Адзінства трох перспектыў у мове. Тэмпарытм – важны выразны сродак мовы. Інтанацыйнае багацце мовы. Выхаванне эмацыянальнага тэмбру (уменне змяняць адценне голасу са зменай перажыванняў, стану, адносін) як найвышэйшая ступень валодання выразнасцю вуснага слова. Вымаўленне, інтанаванне, тэмбраванне як асноўныя акты моўнага дзеяння і ўспрымання мовы слухачамі. К. С. Станіслаўскі аб трох перспектывах мовы. Законы перспектывы ў моўным дзеянні. Выразнасць мовы ва ўмовах святочнага дзеяння. Выхаванне ўсіх кампанентаў моўнага слыху як абавязковая ўмова ўзбагачэння выразнасці мовы.

*Тэма 8. Увасабленне вучэбна-творчага матэрыялу на сцэнічнай пляцоўцы*

Творчы акт выканання: псіхалагічны настрой на выступленне шляхам знаходжання разнастайных прыёмаў, аднаўленне ў памяці выканальніцкай задачы і логікі развіцця дзеяння. Пры выхадзе на сцэну: знаходжанне зручнай позы, мізансцэны для адчування творчага настрою, авалоданне ўвагай, устанаўленне

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

кантакту са слухачамі. Пры моўным дзеянні: увага да ўнутраных і знешніх аб’ектаў зносін з мэтай выклікаць бачанні ва ўяўленні слухачоў, імгненнасць нараджэння слова, яскравасць пачуццяў, адносіны да перадаваемага, падпарадкаванне выразных сродкаў мовы раскрыццю ідэі твора, дасягненню пастаўленай звышзадачы. Аналіз выступлення: адказнасць выступлення; акт выступлення як учынак, каштоўнасць якога вызначаецца выбарам матэрыялу і майстэрствам яго падачы. Работа пасля выступлення. Ацэнка выступлення студэнтамі групы. Падвядзенне вынікаў, самааналіз і калектыўны аналіз выступлення.

## Раздзел III. Мастацкае слова і слоўнае дзеянне

### *Тэма 9. Невербальныя сродкі выразнасці*

Навука паралінгвістыка аб сутнасці, функцыях, ролі невербальных сродкаў зносін. Парамова як сукупнасць сродкаў моўнага ўзаемадзеяння. Міміка, жэсты, рухі, мізансцэны, скульптурныя групы як мова пачуццяў. Парамова ў сістэме зваротных сувязей. Актыўнасць позы ў мастацтве моўнага дзеяння. Жэсты і іх асаблівасці. Умоўныя жэсты. Нацыянальны, інтэрнацыянальны, вузкасацыяльны, класавы характар умоўных жэстаў. Няўмоўныя жэсты. Жэсты, якія ўказваюць на прадмет, паказваюць яго прыметы, падкрэсліваюць пэўныя асаблівасці. Іх роля ў моўных зносінах. Каардынацыя мовы і руху. Псіхолага-сацыяльная функцыя мімікі. Міміка ў дапаўненне да таго, што перадаецца словамі. Тыповыя памылкі выканаўцы ў сцэнічных зносінах. Парамова ў маналагічнай мове (прамове) і ў моўным хоры. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні парамовы ў сцэнічных умовах. Інтанацыя як дадатковы паралінгвістычны канал сувязі. Барацьба  інтанацый – сутнасць моўнага дзеяння.

### *Тэма 10. Слоўнае дзеянне ў разнажанравых мастацкіх тэкстах*

Спецыфічныя законы выканання мастацкага слова. Прырода матэрыялу разнастайных літаратурных жанраў. Прамы кантакт з гледачом. Асобая роля ўяўлення і мыслення ў выканальніцкім мастацтве. Асэнсаванне моўнага вобраза, воля, увага, сацыяльная значнасць пачуцця ў майстэрстве мастацкага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слова. Адносіны як адлюстраванне светапогляду, пераканання і характару выканаўцы, як крыніца нараджэння пачуццяў. Функцыі жывога дзейснага слова ў святах, тэатралізаваных прадстаўленнях, канцэртах, мітынгах, відовішчах. Моўнае дзеянне ў абрадах як сродак фарміравання каштоўных арыентацый і маральных якасцей асобы. Слоўнае дзеянне ў стварэнні драматургічнага зараду і дакладнага руху свята. Прырода матэрыялу разнастайных літаратурных жанраў. Скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, лічылкі, загадкі і іншае як першы вучэбна-трэніровачны матэрыял у развіцці знешняй і ўнутранай тэхнікі слоўнага дзеяння. Апісальная проза, публіцыстыка як першы вучэбна-творчы матэрыял, які развівае элементы ўнутранай і знешняй тэхнікі слоўнага дзеяння. Жанры літаратуры ў кантэксце выхавання пачуцця гумару, тэмпераменту; у фарміраванні лірычнага, гераічнага, драматычнага, пачаткаў творчай асобы студэнта.

### *Тэма 11. Эпічныя жанры ў тэатралізаваным прадстаўленні і свяце*

Байка і казка як найбольш лаканічныя, дынамічныя, захапляльныя формы эпічнага жанру, найбольш яркія выразнікі росту свядомасці чалавека, якія дапамагаюць вызваліцца ад заганаў і недахопаў. Прырода нараджэння баек. Байкапісцы Эзоп, І. Крылоў, К. Крапіва, Э. Валасевіч, У. Корбан, М. Скрыпка і іншыя выразнікі нацыянальнага духу народа і эпохі. Характэрныя асаблівасці байкі: камедыйна-сатырычны змест, алегарычнае адлюстраванне характараў і ўчынкаў людзей; сцвярджэнне канкрэтнай маральна-сацыяльнай ісціны; адлюстраванне адносін аўтара да станоўчага і адмоўнага; прастата кампазіцыйнай пабудовы; займальнасць і лаканізм сюжэта; устойлівая характарыстыка герояў (багаты–бедны, праўдзівы–ілгун, добры–злы); фармуліроўка ідэі ў маралі твора; вершаваная форма. Прыёмы камічнага ў байках: алегорыя, іншасказанне, неадпаведнасць паміж знешнасцю і тым, што за ёй хаваецца, паміж ілюзіяй і рэчаіснасцю; перавелічэнне і прымяншэнне; агаленне кантрасту; змяшанне стыляў ці «сумяшчэнне планаў», прыём нечаканасці. Сацыяльныя вытокі ўзнікнення казкі. Казка як універсальны жанр літаратуры. Народнасць, наватарства, нацыянальны каларыт, сацыяльная накіраванасць літаратурных казак.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 12. Увасабленне вучэбна-творчага матэрыялу на сцэнічнай пляцоўцы*

Спецыфіка стварэння кінастужкі бачанняў. Аглюцінацыя (стварэнне баечнага вобраза шляхам далучэння да аблічча жывёлы рыс і якасцей чалавека). Методыка работы над увасабленнем выканальніцкай задумы. Выкананне байкі, казкі, легенды, падання, балады. Вобраз апавядальніка ў казцы як абагульнены «твар народа», які ўсё разумее, усё ведае. Асаблівасці выканання казак. Мэтавыя ўстаноўкі работы над байкай і казкай з рэжысёрамі свята. Сатыра і гумар як формы камічнага. Гумарыстычныя і сатырычныя пазіцыі. Іронія. Імёны дзеючых асоб, мараль, мова як арыенціры ў распазнаванні адносін аўтара да перадаваемага. Вольны памер верша, баек у стварэнні размоўнай інтанацыі. Казка ў развіцці вобразнага мыслення, выразных сродкаў мовы, у выхаванні размоўнасці і імправізацыйнасці мовы.

## Раздзел IV. Слоўнае дзеянне ў рабоце над вершаваным творам

*Тэма 13. Ускладнены комплексны трэнінг*

Псіхафізічны трэнінг: развіццё і ўдасканаленне мышачнай сістэмы, псіхічнай узбудлівасці, эмацыянальнай заразлівасці; практыкаванні: слухаем – уяўляем – адчуваем – робім; псіхічная рэлаксацыя і актывізацыя; асноўныя сродкі сцэнічнага ўвасаблення акцёрскіх вобразаў; моўная характарнасць і сцэнічная камунікацыя як аснова слоўнага дзеяння; элементы тэхнічнай выразнасці мовы ў трэніровачных эцюдах і кампазіцыях (скорагаворкі, вершаваныя творы ў руху, з прадметам, з выкарыстаннем музычна-шумавых элементаў).

*Тэма 14. Спецыфіка вершаваных твораў*

Роля вершаванага матэрыялу ў павышэнні эмацыянальнага гучання святочных дзеянняў і прадстаўленняў. Паэзія ў развіцці лірычных, грамадзянскіх пачуццяў чалавека. Асновы вершаскладання. Сілаба-танічная сістэма вершаскладання. Рытм верша. Стапа. Харэй, ямб, дактыль, амфібрахій, анапест як асноўныя памеры сілаба-танічнай сістэмы вершаскладання. Паняцці «пірыхій», «спандэй». Рыфма і яе арганізуючая роля.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце «клаўзула». Спосабы рыфмоўкі. Цэзура. Пастаянная паўза ў вершы. Пераносы, інверсія як сродкі павышэння эмацыянальнай выразнасці вершаванай мовы. Фактары, якія вызначаюць рытм верша. Страфа і яе разнастайнасць: двухрадкоўе–дзесяцірадкоўе, анегінская страфа. Санеты. Балада. Гекзаметр. Вольны, белы, свабодны верш. Алітэрацыя. Асананс. Гукапіс. Асноўныя тыпы вершаваных інтанацый. Асноўныя паэтычныя жанры.

*Тэма 15. Выхаванне навыкаў выканання вершаваных твораў*

Ідэйна-дзейсны аналіз твора ў адзінстве з вывучэннем творчай асобы аўтара, стварэннем «біяграфіі» вершаў. Прыёмы авалодання вершаваным матэрыялам: скандзіраванне, гульня ў «метраном», дырыжыраванне аб'ёмнасцю слоў, адбор вершаў на ўсе памеры сілаба-танічнай сістэмы вершаскладання з прыкладамі «пераносу». Падпарадкаванне музычнага рытму верша логіцы мовы. Вызначэнне асноўнай інтанацыі верша. Барацьба з найбольш тыповымі памылкамі пры выкананні вершаў: дэкламацыя, парушэнне формы верша, фальшывы пафас. Прастата і паэтычнасць выканання. Рознааб'ёмнасць гучання слоў; замена пісьмовай пунктуацыі вуснай, выканальніцкай; тэмпарытмічная рухомасць як прыёмы, што вядуць да прастаты і імправізацыйнасці гучання вершаў. Характар зносін у лірычным матэрыяле. Жэсты і фізіка цела на сцэнічнай пляцоўцы. Навык выканання вершаванага матэрыялу ў суправаджэнні музыкі.

## Раздзел V. Маналог як разнавіднасць маўлення

*Тэма 16. Жанравыя асаблівасці маналагічнай мовы*

Маналог як разнавіднасць маўлення. Віды драматургічнага маналогу. Псіхалагічная сіла ўздзеяння маналогу. Прырода нараджэння маналогу. Характэрныя асаблівасці маналогу: багацце пытанняў, меркаванняў, довадаў, сцвярджэнняў і адмоў, прыняцце рашэнняў і адказ ад іх; мноства вобразаў і асацыяцый; багацце параўнанняў, супастаўленняў, перавелічэнняў, паэтычных вобразаў, эмацыянальная абвостранасць; самазагады; барацьба думак і інтанацый. Віды маналогаў у

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

свяце: драматургічны, літаратурны, эстрадны. Інтымная і грамадзянская лірыка ў свяце як дзейсная форма ўнутранага ці зваротнага маналогу.

*Тэма 17. План работы над маналогам*

Прыкладны план работы над маналогам (ці лірычным вершам): вывучэнне п’есы або апавядання, вызначэнне месца і значэння вершаў у эпізодзе свята; вызначэнне падзеі, якая з’явілася асновай для маналогу, праблемы, якую вырашае герой; ідэйна-дзейсны аналіз тэксту; удакладненне аб’екта зносін; фармуліраванне рашэння, да якога прыходзіць герой; аналіз логікі развіцця дзеяння пасля маналогу; стварэнне кінастужкі бачанняў; перавод маналогу ў фізіку жыцця цела; вызначэнне мастацкай перспектывы; выхаванне мышачнага кантралёра; авалоданне арганічным жыццём у вершаванай форме.

*Тэма 18. Выразныя сцэнічныя сродкі*
*ўвасаблення розных відаў маналогу*

Фізічныя паводзіны ў маналогу; мышачнае разняволенне – неабходная ўмова сканцэнтраванасці думак і дзеяння ў маналогу; эмацыянальна-дзейсная сіла маналогу; дыкцыя ў маналогу; дынамічны і гукавышынны дыяпазоны; тэмпарытм у маналагічнай мове; работа над ажыццяўленнем уваходу і выхаду з пляцоўкі; пластыка як выразны сродак дзеяння ў маналогу; дадатковыя выразныя сродкі ў маналогу (касцюм, прадмет, сцэнаграфія, святло, музычна-шумавыя элементы); сцэнічнае выкананне маналогу.

## Раздзел VI. Літаратурныя кампазіцыя і мантаж як часткі святочнай дзеі

*Тэма 19. Прынцыпы стварэння літаратурнай кампазіцыі*
*і мантажу*

Кампазіцыя і мантаж. Гісторыя нараджэння кампазіцыі і мантажу. Стварэнне кампазіцый шляхам скарачэння матэрыялу з захаваннем асноўнай тэмы і сэнсу, асноўных персанажаў (дзеючых асоб). Стварэнне кампазіцыі шляхам выдзялення асобных герояў або асобнай тэмы. Патрабаванні да мантажу:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наяўнасць асноўнай тэмы і ідэі, якія аб'ядноўваюць літаратурны матэрыял мантажу, арганічнае спалучэнне розных жанраў, якія раскрываюць, удакладняюць думкі, вобразы. Падпарадкаванне ідэі – вядучы прынцып як складання, так і ўвасаблення кампазіцыі і мантажу. Спосабы стварэння кампазіцыі (гістарычны, храналагічны, геаграфічны, індуктыўны, дэдуктыўны, кантраст, паўтор).

*Тэма 20. Законы выканання літаратурнай кампазіцыі і мантажу*

Прынцыпы работы над увасабленнем кампазіцыі і мантажу. Вызначэнне экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння, канфлікту, кульмінацыі, скразнога дзеяння, контрдзеяння. Валоданне ўменнямі натуральнага пераходу ад аднаго віду твора да другога, не парываючы развіццё падзей да звышзадачы. Валоданне дзеяннем у моманты калектыўнага чытання і ў час музычнага суправаджэння і г. д. Унутраная напоўненасць моманту маўчання. Слова і мізансцэна. Актыўная мізансцэна. Высокі ўзровень унутранай і знешняй тэхнікі. Спосабы зносін выканаўцаў з аўдыторыяй.

*Тэма 21. Калектыўнае слоўнае дзеянне ў літаратурнай кампазіцыі*

Прырода нараджэння маўленчага хору. Агульнасць дзеяння і пачуццяў у маўленчым хоры. Маўленчы хор у свяце. Эмацыянальна-дзейсная сіла маўленчага хору. Функцыі рэжысёра пры стварэнні маўленчага хору. Прыёмы стварэння партытуры гучання хору. Спецыфічныя знакі партытуры маўленчага хору. Навык дырыжыравання маўленчым хорам. Дыкцыя ў маўленчым хоры. Слова і рух у маўленчым хоры. Дынамічны і гукавышынны дыяпазоны, тэмпарытм мовы ў мастацтве маўленчага хору. Метадычныя прыёмы дасягнення якаснага гучання і калектыўнага слоўнага дзеяння хору.

*Тэма 22. Асаблівасці работы вядучага ў тэатралізаваным прадстаўленні і свяце*

Моўная арганізацыя свята, абраду. Роля і функцыі вядучага. Комплекснае выкарыстанне сістэм для ўздзеяння на аўдыторыю: лінгвістычнай (мова), паралінгвістычнай (інтанацыя), кінетычнай (міміка, жэсты). Культура мовы вядучага. Валоданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лексікай і стылістыкай мовы. Моўная імправізацыя. Кантакт з гледачамі, слухачамі, удзельнікамі свята. Галасавыя прыёмы: змена тэмпарытму мовы, паўза, гумар і інш. Правілы карыстання мікрафонам. Камунікатыўнае і эстэтычнае значэнне мілагучнасці і тэмпарытму мовы. Навык ціхага апорнага гучання голасу. Натуральнасць і дакладнасць інтанацыі. Навыкі чытання закадравага тэксту з набліжэннем да размоўнай інтанацыі, з захаваннем адчування жывых зносін з нябачным гледачом. Паводзіны прамоўцы, вядучага перад мікрафонам.

## Раздзел VII. Арганізацыя вывучэння тэорыі і методыкі дысцыпліны

### *Тэма 23. Тэорыя і методыка работы над знешняй і ўнутранай тэхнікай слоўнага дзеяння*

Аналіз асноўнай і дадатковай літаратуры па тэме. Засваенне асноўных палажэнняў і катэгорый. Дыскусіі, гутаркі па абмеркаванні спецыяльнай літаратуры розных аўтараў. Мэтавыя ўстаноўкі практыкаванняў галасамоўнага трэнінгу. Паэтапнасць фарміравання выканальніцкіх навыкаў. Прынцып комплекснай трэніроўкі ўнутранай і знешняй тэхнікі слоўнага дзеяння са зменай устаноўкі на выхаванне разнастайных кампанентаў моўнага працэсу. Прынцып падпарадкавання любога тэхнічнага задання ўяўнаму або рэальнаму дзеянню. Прынцыпы выбару вучэбна-творчага матэрыялу. Сістэма заданняў па практычным засваенні матэрыялу. Формы кантролю. Аналіз практычных паказаў паводле схемы ацэнкі выступлення.

### *Тэма 24. Тэорыя і методыка правядзення групавых і індывідуальных заняткаў*

Змест індывідуальных і групавых заняткаў па тэхніцы мовы. Творчыя магчымасці студэнтаў. Індывідуальны падыход. Моўная характарыстыка студэнтаў. Падбор індывідуальных практыкаванняў. Методыка правядзення калектыўнага і індывідуальнага трэнінгу. Стварэнне творчай атмасферы. Аналіз студэнцкіх работ выкладчыкам і студэнтамі, формы кантролю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 25. Тэорыя і методыка валодання прынцыпамі маўленчага хору*

Вывучэнне спецыяльнай літаратуры па тэме. Засваенне асноўных тэарэтычных палажэнняў па маўленчым хоры. Прынцыпы выбару матэрыялу для маўленчага хору. Законы складання партытуры для маўленчага хору. План работы над тэкстам калектыўнага дзеяння ў сцэнічных умовах. Прыёмы дырыжыравання маўленчым хорам. Схема ацэнкі выступлення маўленчага хору. Метадычныя прыёмы ў галасамоўным трэнінгу.

*Тэма 26. Выхаванне педагагічных здольнасцей работы над словам*

Самааналіз і аналіз выкладчыкам творчага росту студэнтаў шляхам складання «моўнага пашпарта», вядзенне дзённіка куратарскай, рэжысёрскай, педагагічнай работы па ўсіх раздзелах дысцыпліны. Выхаванне ўмення пераносіць навыкі слоўнага дзеяння на святочную пляцоўку. Творчае прымяненне атрыманых ведаў, навыкаў і ўменняў работы над словам у эцюдах, рэжысёрскіх інсцэніроўках, гульнявых праграмах, абрадах, прадстаўленнях, святах. Авалоданне жанравымі асаблівасцямі матэрыялу, які выконваецца. Аналіз работы ў групе паводле схемы ацэнкі выступлення.

*Тэма 27. Развіццё рэжысёрска-педагагічных здольнасцей у рабоце з выканаўцам над слоўным дзеяннем*

Засваенне тэарэтычных і метадычных аспектаў дысцыпліны праз творчую працу студэнтаў. Практычныя спосабы і прыёмы засваення матэрыялу пад кіраўніцтвам выкладчыка. Прынцып паслядоўнасці, паэтапнасці засваення ўсіх раздзелаў дысцыпліны. Цыклічнасць навучання (са зваротам да адных і тых жа пытанняў і раздзелаў) пры ўскладненні пастаўленых перад студэнтамі творчых і тэхнічных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Лекц. | Практ. заняткі | Інд. заняткі | Коль-касць гадзін КСР | Форма кантр. ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| Уводзіны | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Тэхніка мовы** | | | | | |
| *Тэма 1.* Анатомія і фізіяло-гія галасамоўнага апарату | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Знешняя тэхніка маўлення (дыханне, голас, дыкцыя арфаэпія) | 2 | 4 | | | праслу-хоўванне |
| *Тэма 3.* Практычнае выха-ванне элементаў знешняй тэхнікі слоўнага дзеяння | | 4 | 2 | 4 | |
| *Тэма 4.* Комплексны трэ-нінг (псіхафізічны, дыхаль-на-галасавы, дыкцыйна-арфаэпічны) | | 8 | 4 | 4 | прагляд |
| **Раздзел II. Слоўнае дзеянне** | | | | | |
| *Тэма 5.* Элементы ўнутра-най тэхнікі слоўнага дзеян-ня ў выканальніцкім май-стэрстве | 2 | 2 | 4 | | |
| *Тэма 6.* Этапы работы над тэкстам | | 4 | 2 | | |
| *Тэма 7.* Інтанацыйна-мела-дычныя сродкі слоўнага дзеяння | 2 | 2 | | 4 | праслу-хоўванне |
| *Тэма 8.* Увасабленне вучэб-на-творчага матэрыялу на сцэнічнай пляцоўцы | | 8 | 4 | 4 | прагляд |
| **Раздзел III. Мастацкае слова і слоўнае дзеянне** | | | | | |
| *Тэма 9.* Невербальныя сродкі выразнасці | | 4 | | 4 | прагляд |
| *Тэма 10.* Слоўнае дзеянне ў разнажанравых мастацкіх тэкстах | | 4 | | | |
| *Тэма 11.* Эпічныя жанры ў тэатралізаваным прадстаў-ленні і свяце | 2 | 2 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 12*. Увасабленне вучэбна-творчага матэрыялу на сцэнічнай пляцоўцы | | 6 | 6 | | |
| **Раздзел IV. Слоўнае дзеянне ў рабоце над вершаваным творам** | | | | | |
| *Тэма 13*. Ускладнены комплексны трэнінг | | 2 | | | |
| *Тэма 14*. Спецыфіка вершаваных твораў | 2 | | | 4 | праслухоўванне |
| *Тэма 15*. Выхаванне навыкаў выканання вершаваных твораў | | 4 | 6 | | |
| **Раздзел V. Маналог як разнавіднасць маўлення** | | | | | |
| *Тэма 16*. Жанравыя асаблівасці маналагічнай мовы | 2 | 6 | 2 | | |
| *Тэма 17*. План работы над маналогам | | 4 | 2 | 6 | паведамленне |
| *Тэма 18*. Выразныя сцэнічныя сродкі ўвасаблення розных відаў маналогу | 2 | 10 | 2 | | |
| **Раздзел VI. Літаратурныя кампазіцыя і мантаж як часткі святочнай дзеі** | | | | | |
| *Тэма 19*. Прынцыпы стварэння літаратурнай кампазіцыі і мантажу | 2 | 6 | 2 | | |
| *Тэма 20*. Законы выканання літаратурнай кампазіцыі і мантажу | | 8 | 2 | | |
| *Тэма 21*. Калектыўнае слоўнае дзеянне ў літаратурнай кампазіцыі | | 10 | | 4 | праслухоўванне |
| *Тэма 22*. Асаблівасці работы вядучага ў тэатралізаваным прадстаўленні і святце | | 4 | 2 | | |
| **Раздзел VII. Арганізацыя вывучэння тэорыі і методыкі дысцыпліны** | | | | | |
| *Тэма 23*. Тэорыя і методыка работы над знешняй і ўнутранай тэхнікай слоўнага дзеяння | 2 | | | | |
| *Тэма 24*. Тэорыя і методыка правядзення групавых і індывідуальных заняткаў | | 2 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 25.* Тэорыя і методыка валодання прынцыпамі маўленчага хору | | | 2 | 6 | праслухоўванне |
| *Тэма 26.* Выхаванне педагагічных здольнасцей работы са словам | | | 4 | | |
| *Тэма 27.* Развіццё рэжысёрска-педагагічных здольнасцей у рабоце з выканаўцам над слоўным дзеяннем | | 2 | 4 | 4 | прагляд |
| **Усяго…** | **22** | **106** | **50** | **44** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*Вановская, Е. В.* Литературная композиция и монтаж на самодеятельной сцене / Е. В. Вановская. – Л. : ЛГИК, 1989. – 79 с.

*Вербовая, Н. П.* Искусство речи : учеб. пособие для театр. вузов / Н. П. Вербовая, О. М. Головина, В. В. Урнова. – 2-е изд., доп. и испр. – М. : Искусство, 1977. – 302 с.

*Гурова, В. И.*Сценическая речь (работа над текстом) : учеб. пособие / В. И. Гурова, М. В. Гонссовская, Л. А. Фролова. – М. : МГИК, 1986. – 79 с.

*Дасько, А. А.* Основы ораторского искусства : учеб.-метод. пособие для вузов / А. А. Дасько. – Минск : РИВШ, 2005. – 96 с.

*Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М. : Музыка, 1968. – 675 с.

*Запорожец, Т. И.* Логика сценической речи : учеб. пособие для театр. и культ.-просвет. учеб. заведений / Т. И. Запорожец. – М. : Просвещение, 1974. – 127 с.

*Каляда, А. А.* Сцэнічная мова : навуч. дапам. для студ. і навуч. выш. і сярэд. навуч. устаноў культуры і мастацтваў / А. Каляда, А. Шагідзевіч. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 169 с.

*Каляда, А. А.* Слоўнік акцёра і рэжысёра / А. А. Каляда. – Мінск : Выш. шк., 1995. – 210 с.

*Каляда, А. А.* Сцэнічная мова : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Каляда. – Мінск : Беллітфонд, 2006. – 478 с.

*Катышева, Д. Н.* Литературный театр / Д. Н. Катышева. – М. : Сов. Россия, 1982. – 141 с.

*Кочарян, С. А.* В поисках живого слова / С. А. Кочарян. – 2-е изд. – М. : ВТО, 1979. – 296 с.

*Петрова, А. Н.* Сценическая речь / А. Н. Петрова. – М. : Искусство, 1981. – 191 с.

*Промптова, И. Ю.* Воспитание речевой культуры режиссера. Словесное действие : лекция для студ. реж. фак. театр. вузов / И. Ю. Промптова. – М. : ГИТИС, 1978. – 92 с.

*Рагойша, В. П.* Гутаркі пра верш. Метрыка. Рытміка. Фоніка / В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 1979. – 126 с.

*Русецкий, В. Ф.* Культура речи учителя : практикум : учеб. пособие для студ. филол. спец. высш. учеб. заведений / В. Ф. Русецкий. – Минск : Университетское, 1999. – 239 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Савкова, З. В.* Техника звучащего слова / З. В. Савкова. – Л. : ЛГИК, 1985. – 96 с.

*Савкова, З. В.* Монолог в искусстве массовых представлений / З. В. Савкова. – Л. : ЛГИК, 1977. – 82 с.

*Савкова, З. В.* Поэзия на самодеятельной сцене : метод. материалы / З. В. Савкова. – Л. : ЛГИК, 1990. – 83 с.

*Сарабьян, Э.* Актерский тренинг по системе Станиславского. Речь. Слова. Голос. Максимальная достоверность и убедительность / Э. Сарабьян. – М. : АСТ, 2010. – 160 с.

*Сащеко, В. В.* Техника речи : практикум для студ. высш. учеб. заведений по направлению специальности 1-18 01 01-03 Народное творчество (театральное) / В. В. Сащеко, Д. Г. Тытюк. – Минск : БГУКИ, 2012. – 66 с.

Словарь литературоведческих терминов. – М. : Просвещение, 1974. – 370 с.

*Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т. 1. – 615 с. – (Гл. «Актер должен уметь говорить»).

*Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1954. – Т. 2. – 422 с. – (Гл. «Действие»).

*Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1955. – Т. 3. – 343 с. – (С. 80–136, 191–201, 325–344).

Сценическая речь : метод. указания и советы по предметам речевого цикла для слушат. фак. повыш. квалификации / Ленингр. гос. ин-т культуры ; сост. З. В. Савкова [и др.]. – Л., 1987. – 102 с.

Сценическая речь : учеб. для студ. театр. учеб. заведений / Рос. акад. театр. искусства ; науч. ред. И. П. Козляниновой, И. Ю. Промптовой. – 5-е изд., испр. и доп. – М. : ГИТИС, 2009. – 557 с.

Сценическая речь : учеб. пособие для сред. театр. и культ.-просвет. учеб. заведений и ин-тов культуры / С. А. Аристархова [и др.] ; под ред. И. П. Козляниновой. – М. : Просвещение, 1976. – 336 с.

*Шагидевич, А. А.* Воспитание речевого голоса / А. А. Шагидевич. – Минск : Бестпринт, 1999. – 65 с.

*Шагидевич, А. А.* Словесное действие и речевая выразительность / А. А. Шагидевич. – Минск : Бестпринт, 1999. – 100 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Шагидевич, А. А.* Сценическая речь : учеб. пособие для учащ. сред. спец. учеб. заведений культуры и искусства / А. А. Шагидевич. – Минск : ДизайнПРО, 2000. – 287 с.

*Яхонтов, В. Н.* Театр одного актера / В. Н. Яхонтов. – М. : Искусство, 1958. – 455 с.

*Дадатковая*

*Артоболевский, Г. В.* Художественное чтение : книга для учителей и рук. худож. самодеятельности / Г. В. Артоболевский ; сост. и автор вступ. части К. Лубенская. – М. : Просвещение, 1978. – 240 с.

*Баханькоў, А. Я.* Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. – 4-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – 395 с.

*Грынчык, М. М.* Шляхі беларускага вершаскладання / М. М. Грынчык. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1973. – 264.

*Каляда, А. А.* Выразнае чытанне : вучэб. дапам. для студ. філал. фак. пед. ін-таў / А. А. Каляда. – 3-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 270 с.

*Кнебель, М. О.* Слово в творчестве актера / М. О. Кнебель. – М. : ГИТИС, 2009. – 160 с.

*Козлянинова, И. П.* Произношение и дикция / И. П. Козлянинова. – 2-е изд., доп. – М. : ВТО, 1977. – 151 с.

*Комякова, Г. В.* Технические средства обучения в воспитании навыков сценической речи : учеб. пособие / Г. В. Комякова. – Л. : ЛГИК, 1990. – 53 с.

Культура речи на сцене и на экране / АН СССР, Ин-т русского языка ; отв. ред. Л. И. Скворцов, Л. Н. Кузнецова. – М. : Наука, 1986. – 190 с.

*Петрова, Э. А.* Искусство рассказа / Э. А. Петрова. – Л. : ЛГИК, 1973. – 86 с.

*Петрова, Э. А.* Культура речи в искусстве устной пропаганды : учеб. пособие по курсу «Сценическая речь» / Э. А. Петрова. – Л. : ЛГИК, 1988. – 72 с.

*Почикаева, Н. М.* Искусство речи : учеб. пособие для учащ. училищ искусств и культуры / Н. М. Почикаева. – М. ; Ростов н/Д : МарТ, 2005. – 352 с.

*Ралько, І. Д.* Верш і мова : (праблемы тэорыі і гісторыі беларускага верша) / І. Д. Ралько ; рэд. У. В. Гніламёдаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. К. Кабаковіч, Т. К. Чабан ; АН БССР, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 263 с.

*Савкова, З. В.* Литературная композиция и монтаж / З. В. Савкова. – Л. : ЛГИК, 1985. – 106 с.

*Станиславский, К. С.* Работа актера над собой. Работа над собой в творческом процессе воплощения / К. С. Станиславский. – М. : АСТ ; СПб. : Прайм-Еврознак, 2010. – 448 с. – (Актерский тренинг. Учебник актерского мастерства).

Театр, где играют дети : учеб.-метод. пособие для рук. детских театр. коллективов / И. Б. Белюшкина [и др.] ; под. ред. А. Б. Никитиной. – М. : ВЛАДОС, 2001. – 286 с.

*Чурилова, Э. Г.* Методика и организация театрализованной деятельности дошкольников и младших школьников : программа и репертуар / Э. Г. Чурилова. – М. : ВЛАДОС, 2004. – 159 с.

*Янкоўскі, Ф. М.* Сучасная беларуская мова / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Выш. шк., 1984. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя кіруемай самастойнай работы

*Мэта:* павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста праз сфарміраванасць дастатковай ступені падрыхтаванасці студэнтаў да самастойнай працы.

*Задачы:*

– выпрацоўка ў студэнта навыкаў прадуктыўнай дзейнасці, інавацыйна-творчага і культуралагічнага мыслення, пазнавальных здольнасцей;

– паглыбленае вывучэнне спецдысцыпліны «Слоўнае дзеянне ў свяце»;

– актывізацыя самаразвіцця і матывацыі самарэалізацыі студэнта.

Асноўныя *формы* арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

– падрыхтоўка паказаў і рэчытатыўных выступаў па тэматыцы вучэбнай дысцыпліны;

– аналіз навуковых і навукова-публіцыстычных артыкулаў па тэматыцы вучэбнай дысцыпліны;

– падрыхтоўка да ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях;

– самастойная адпрацоўка практычных навыкаў з выкарыстаннем відэаматэрыялаў;

– распрацоўка культурна-адпачынкавых праграм і сацыяльна-культурных праектаў, заснаваных на рэальнай інфармацыі, і якія патрабуюць ужывання ведаў, атрыманых з вывучаемай дысцыпліны.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных ведаў і практычных навыкаў студэнта рэкамендуецца выкарыстоўваць такія формы, як прагляд, праслухоўванне творчых заданняў, аналіз пісьмовых работ, вуснае апытанне, заслухоўванне дакладаў, прагляд мультымедыйных прэзентацый і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў распрацаваны з улікам шматгадовай практыкі правядзення залікова-экзаменацыйных сесій па спецыяльнай вучэбнай дысцыпліне.

**10 балаў** (надзвычай выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковае і сістэматычнае веданне вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, беспамылкова выканаў усе заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; глыбока засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, а таксама знаёмы з матэрыялам, не запланаваным праграмай; актыўна працаваў на лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне. Студэнт, які паказвае веды, большыя за праграмны матэрыял, студэнт, які не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў і вольна аперыруе асноўнай і рэкамендаванай для самастойнага вывучэння літаратурай, вольна выказвае свае меркаванні па прадмеце, дакладна карыстаецца тэрміналогіяй, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**9 балаў** (выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковае і сістэматычнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, беспамылкова выканаў усе заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, актыўна працаваў на лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне. Студэнт, які не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў і вольна аперыруе асноўнай і рэкамендаванай для самастойнага вывучэння літаратурай, дакладна карыстаецца тэрміналогіяй, паказвае сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**8 балаў** (амаль выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, выканаў усе заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, актыўна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працаваў на лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне. Студэнт, які не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў усю асноўную і рэкамендаваную для самастойнага вывучэння літаратуру, паказаў сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**7 балаў** (вельмі добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, выканаў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў асноўны матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, праявіў актыўнасць на лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне. Студэнт, які не дапусціў сутнасных памылак пры выкананні заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў усю асноўную і рэкамендаваную для самастойнага вывучэння літаратуру, паказаў сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**6 балаў** (добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастаткова поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны, выканаў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў асноўны матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, прымаў дастаткова актыўны ўдзел у лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне і веды якога маюць сістэматычны характар.

**5 балаў** (амаль добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны ў аб'ёме, неабходным для далейшага навучання і працы па абранай прафесіі, выконваў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, прымаў дастаткова актыўны ўдзел у лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне, але дапускаў памылкі пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене; студэнт, які валодае неабходнымі ведамі па праграме дысцыпліны для ліквідацыі хібаў самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**4 балы** (дастаткова здавальняюча) – заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны ў аб’ёме, неабходным для далейшай вучобы і авалодання прафесіяй, выконваў асноўныя заданні дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; імкнуўся засвоіць матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, але не прымаў актыўнага ўдзелу ў лекцыйных, практычных, семінарскіх і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне; дапускаў некаторыя памылкі пры выкананні заданняў і адказе на экзамене; але тым не менш валодае неабходнымі ведамі для ліквідацыі прабелаў пад кіраўніцтвам выкладчыка.

**1–3 балы** (нездавальняюча) – заслугоўвае студэнт, адказ якога выяўляе значныя прабелы ў ведах па большай частцы асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме; студэнт, які не выканаў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; не засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; студэнт, які не адпрацаваў асноўныя лекцыйныя, практычныя, семінарскія і індывідуальныя заняткі па дадзенай дысцыпліне; не здольны працягваць навучанне або прыступіць да прафесійнай дзейнасці без дадатковых заняткаў з выкладчыкам па адпаведнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# СЛОЎНАЕ ДЗЕЯННЕ Ў СВЯЦЕ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 1,26. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ